# ПРАВІЛЫ ДОБРЫХ КАНІКУЛ

## Спецыялісты нагадалі, як правесці лета без траўмаў



**Большасць ДТЗ, у якіх церпяць дзеці, здараецца ў цёплы час года. Гінуць у вадзе школьнікі таксама пераважна летам. Доўгія канікулы — перыяд вялікай адказнасці для бацькоў, і напярэдадні лета важна нагадаць дзецям аб правілах паводзін на дарогах, вадаёмах, у лесе і іншых месцах.**

Паводле інфармацыі **старшага навуковага супрацоўніка РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, дзіцячага артапеда-траўматолага Аляксандра МУХЛІ**, у структуры дзіцячай смяротнасці ад знешніх прычын на першым месцы знаходзяцца ДТЗ (20 %), на другім — утапленні (19,5 %), на трэцім — самагубствы (18,8 %). Нягледзячы на тое, што апошнія дзесяць гадоў лічбы дзіцячага траўматызму ў цэлым і пацярпелых у ДТЗ у прыватнасці зніжаюцца, паказчыкі ўсё роўна застаюцца дастаткова высокія. У ДТЗ, якія здарыліся сёлета, ужо загінула шэсць дзяцей і 125 паранена. Сярод загінулых чацвёра былі пасажырамі аўто, адзін хлопчык — веласіпедыстам. Прычым у большасці выпадкаў за рулём знаходзіліся маці, якія не справіліся з кіраваннем. Жанчына, якая перавозіла чатырох дзяцей, выехала для абгону на сустрэчную паласу руху, зразумела, што не паспявае, і вярнулася ў сваю, зачапіўшы абочыну. У выніку машыну вынесла на сустрэчную паласу, дзе яна сутыкнулася з іншым аўтамабілем. Двое з чатырох дзяцей загінулі. Яшчэ адна маці перавозіла дзіця ў аўталюльцы, якая ніяк не была замацавана. Жанчына не справілася з кіраваннем, а дзіця таксама загінула.

Як адзначае **старшы інспектар па асобых даручэннях УДАІ МУС Ганна БАНАДЫК**, калі яшчэ 10 гадоў таму 90 % ДТЗ з удзелам дзяцей адбывалася па віне саміх малых, то сёння большасць ДТЗ — па віне дарослых, бо школьнікі ў пераважнай большасці ведаюць і выконваюць правілы паводзін на дарогах. З пачатку года пацярпела 55 дзяцей, якія былі пешаходамі, і толькі 15 з іх парушылі правілы дарожнага руху. Амаль тры дзясяткі дзяцей атрымалі траўмы на пешаходных пераходах. Адметна, што пераважная большасць ішлі або на зялёны сігнал святлафора, або пераходзілі вуліцу па пераходзе, які не рэгулюецца, дзе і пацярпелі з-за няўважлівасці кіроўцаў. Сямёра дзяцей траўміравана ў дварах. Дарэчы, дзеці-кіроўцы таксама становяцца віноўнікамі і ахвярамі ДТЗ. Сёлета пацярпелі 16- і 17-гадовыя хлопцы — яны селі за руль аўтамабіляў, а таксама 14-гадовая дзяўчынка, якая вырашыла пракаціцца на мапедзе.

Каб нагадаць дарослым пра адказнасць падчас перавозкі дзяцей і ўважлівасць на дарогах, супрацоўнікі ДАІ наведаюць працоўныя калектывы, бацькоўскія сходы, выпускныя вечары. А таксама правядуць шэраг акцый. Адна з іх — «Увага, дзеці!» — закране літаральна ўсіх кіроўцаў. З 25 мая па 5 чэрвеня ўсе аўтамабілі павінны рухацца з уключаным святлом фар. За невыкананне гэтага патрабавання прадугледжана адміністрацыйная адказнасць — ад папярэджання да штрафу ў дзве базавыя велічыні. За перавозку дзяцей без аўтакрэслаў ці з непрышпіленымі рамянямі бяспекі прадугледжана яшчэ больш сур'ёзная адказнасць — штраф да чатырох базавых велічынь.

Дарэчы, летась былі праведзены маштабныя праверкі аб'ектаў дарожнай інфраструктуры побач з сярэднімі школамі і гімназіямі, а таксама музычнымі і спартыўнымі школамі. У 74 % былі выяўлены парушэнні, большая частка з якіх ужо ліквідавана. Пераважная большасць устаноў адукацыі належным чынам абсталявана дарожнымі знакамі, «ляжачымі паліцэйскімі» і нават турнікетамі, якія спыняюць выхад на праезную частку.

Падчас пажару сёлета ў краіне загінула адно дзіця. Пажар здарыўся ў лютым у Асіповіцкім раёне. Ён пачаўся ў чатыры гадзіны раніцы ад кароткага замыкання, у агні загінула ўся сям'я. Падчас пажараў і ДТЗ супрацоўнікі МНС выратавалі 14 дзяцей. Як адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ,** бацькі павінны вызначыць для дзяцей так званы радыус бяспекі, у ім могуць знаходзіцца і дарогі, і вадаёмы, і лес. Важна расказаць школьнікам, як паводзіць сябе ў гэтых месцах. Таксама можна ўстанавіць на дзіцячы тэлефон дадатак МНС «Дапамога побач». Там пазначаны не толькі нумары тэлефонаў экстранных службаў, але і правілы паводзін з тэстамі ў больш як 50 небяспечных сітуацыях. МНС праводзіць і сваю акцыю — «Канікулы без дыму і агню».

**Алена КРАВЕЦ.**

■ Надвор'е

## Прыпячэ як у ліпені

### На наступным тыдні будзе да плюс 28

**У гэтыя выхадныя ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будзе вызначаць скандынаўскі антыцыклон, які перамяшчаецца на цэнтральныя раёны Расіі. Антыцыклон сфарміраваны ў халаднаватым паветры, так што ў паўночна-ўсходніх раёнах нашай краіны па начах будзе халаднавата, але днём паветра прагрэецца. А ў пачатку наступнага тыдня ўсталюецца па-летняму цёплае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень тэрыторыя краіны апынецца на перыферыі антыцыклону. Па паўднёва-заходняй частцы дзяржавы пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ў другой палове дня дасягне ад плюс 20 да 26 градусаў. У суботу будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах па крайнім паўднёвым захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі па краіне — слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 па паўночным усходзе да плюс 15 па паўднёвым захадзе краіны. Удзень паветра прагрэецца і будзе 19—26 цяпла.

Пераважна без ападкаў будзе ў нядзелю. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 5 на паўночным усходзе да плюс 13 па паўднёвым захадзе краіны, удзень — ад плюс 20 да плюс 26 градусаў.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак і аўторак умовы надвор'я на тэрыторыі краіны вызначыць антыцыклон. Чакаецца малавоблачнае, без ападкаў надвор'е. Тэмпература паветра па краіне ў начныя гадзіны будзе да 7—14 цяпла, удзень складзе ад плюс 22 да плюс 28 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Далучайцеся

## Зоаветэрынарнае спаборніцтва

### ўпершыню адбудзецца сёлета ў Беларусі

**Пазмагацца за званне «Найлепшай ветэрынарнай клінікі», «Найлепшай ветэрынарнай аптэкі» і «Найлепшага зоамагазіна» па выніках мінулага года змогуць дзяржаўныя і прыватныя аб'екты зоаветэрынарнага бізнесу. Мэта рэспубліканскіх конкурсаў, якія плануецца зрабіць штогадовымі, — абагульніць вопыт найлепшых прадстаўнікоў гэтай галіны, распаўсюдзіць перадавыя тэхналогіі ў лячэбнай і аптэчнай сферах, расказаць грамадству пра тых, хто карыстаецца найбольшым даверам у насельніцтва. Пераможцы і прызёры будуць вызначаны ў канцы чэрвеня.**

Колькасць хатніх гадаванцаў павялічваецца, як і пералік паслуг для жывёл, аднак колькасць прафесійных ветэрынарных клінік і аптэк, асабліва ў маленькіх населеных пунктах, недастатковая. Разам з тым у гэтай сферы няма сур'ёзнай канкурэнцыі. Згодна са статыстыкай на два мільёны гадаванцаў прыходзіцца каля 50 ветэрынарных аптэк.

Арганізаваны конкурс дапаможа не толькі вызначыць найлепшых гульцоў ветэрынарнага рынку, але і больш дакладна вывучыць асартымент клінік і іх тэхнічную абсталяванасць, прааналізаваць цэнаўтварэнне паслуг у гэтай сферы, зразумець, якія спецыялісты працуюць у гэтай галіне, мяркуюць прадстаўнікі аднаго з арганізатараў спаборніцтваў кампаніі «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму».

Галоўнымі суддзямі стануць прафесарска-выкладчыцкі склад Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны і іншыя аўтарытэтныя эксперты ў галіне зоаветэрынарыі.

Для ўдзелу ў спаборніцтвах трэба накіраваць у камісію конкурсную карту, узор якой можна паглядзець на сайце https://atb-belarus.by/, а таксама графікі, табліцы, інфармацыйныя, фота- і відэаматэрыялы, граматы, дыпломы, лісты падзякі. Усе звесткі неабходна збрашураваць у альбом і заверыць подпісам кіраўніка і пячаткай арганізацыі. Інфармацыя ад канкурсантаў прымаецца да 10 чэрвеня на паштовы адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 6, офіс 4 або на электронную скрыню info@atb-belarus.by.

**Ірына СІДАРОК**

■ Трагедыя

## ЕГЕР СТРЭЛІЎ ПА НЕВЫРАЗНА БАЧНАЙ ЦЭЛІ...

**У Мсціслаўскім раёне падчас палявання загінуў чалавек.**

Яго на дзіка і казулю ва ўгоддзях каля вёскі Басценавічы ўвечары праводзіў егер Мсціслаўскай раённай структуры «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў». Апроч самога кіраўніка палявання, у ім удзельнічалі яшчэ два паляўнічыя, а таксама жыхар вёскі Белы Мох. Ён і патрапіў пад выпадковы стрэл.

— Згодна з папярэдняй версіяй, вясковец быў у зарасніку малінніку, куды егер стрэліў, лічачы, думаючы, што там хаваецца казуля. 41-гадовы мужчына атрымаў раненне ў галаву і сканаў на месцы, — расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. — Мсціслаўскі РАУС праводзіць праверку па гэтым здарэнні. Егер прызнаў, што парушыў тэхніку бяспекі палявання — зрабіў стрэл на шум, шоргат, па невыразна бачнай цэлі, што катэгарычна забаронена Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Рэспубліканскі савет Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю члена Прэзідыума Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, былога міністра ўнутраных спраў БССР, старшыні Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, генерал-лейтэнанта ў адстаўцы ПІСКАРОВА Віктара Аляксеевіча і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім.**

**Рэспубліканскі савет Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю намесніка старшыні, члена Прэзідыума Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, палкоўніка ў адстаўцы РЫЛЬКОВА Рыгора Сямёнавіча і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім.**


**Извещение**
**о реализации транспортных средств – спецтехника ОАО «Барановичидрев», имеющих высокий износ**
**1-е повторные торги по Лотам**

**ЛОТ № 14.** Трактор МТЗ-82 АА 54-47 (БУ), инв. № 090672, год выпуска – 1984.
ЦЕНА лота: 22 500,00 рубля, без НДС.
**ЛОТ № 15**. Автокран КС МАЗ-5337 87-60АЕ, инв. № 028952, год выпуска – 1992.
ЦЕНА лота: 45 000,00 рубля, без НДС.
**Состояться 6 июня 2018 года, в 14.00.**
По адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.
Цена Лотов №№ 14, 15 установлена ликвидационной комиссией, без НДС.
Сумма задатка:10 % от начальной цены Лотов в рублях РБ.
Получатель платежа: 225410, ОАО «Барановичидрев», г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.
Р/с: BY68BPSB30121226161389330000; БИК BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, УНН 200299909.
Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.
Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.
Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе в срок до 14.00 01.06.2018 года организатору торгов, председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу:
225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».
Конт. тел.: 8 029 6332490 (vel); (029) 8248026 (МТС); факс (0163) 455124;
Emal: mischuk_am@mail.ru
Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.
Торги осуществляются в соответствии с постановлением СМ РБ № 16 от 08.01.2013.
Более подробно с условиями и объектами аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 26.05.2018 года.